Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ "Залатая літара" ў намінацыі "Найлепшая шматтыражная газета"

26 лютага 2010 года, № 3 (2019)

ФОТАФАКТ




**Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, а таксама воіны-інтэрнацыяналісты 22 лютага сталі галоўнымі героямі патрыятычнай акцыі, прысвечанай Дню абаронцаў Айчыны.**

*Мерапрыемства, арганізаванае ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю, упраўленнем па справах культуры і ваенным факультэтам БДУ, прайшло ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.*

*Гасцей павіншаваў рэктар акадэмік Сяргей Абламейка і іншыя кіраўнікі ВНУ. У акцыі таксама бралі ўдзел супрацоўнікі і студэнты нашага універсітэта.*

МАЙСТРОЎНЯ

## Дакрананне да палітры

***Выстава "Дакрананне да палітры" адкрылася 19 лютага ў будынку рэктарата.***

Саюз жанчын БДУ прымеркаваў яе да Дня абаронцаў Айчыны і Дня жанчын. На выставе прадстаўленыя пейзажы і нацюрморты Яўгена Каробушкіна, а таксама плакаты і акварэлі Якуна Хайруліна. Экспазіцыя працягнецца да 10 сакавіка.

**Даведка**

Яўген Каробушкін нарадзіўся ў 1932 г. у Чарнігаве (Украіна). Скончыў Мінскі педагагічны інстытут імя Максіма Горкага і Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Член Беларускага саюза мастакоў. Працуе ў жанры партрэта, пейзажа, нацюрморта. Узнагароджаны медалём БСМ "За заслугі ў выяўленчым мастацтве".

Якун Хайрулін нарадзіўся ў 1931 г. у Самаркандзе (Узбекістан). Скончыў Ташкенцкае мастацкае вучылішча імя П. Бянькова. Член Беларускага саюза мастакоў. Лаўрэат міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў плаката, узнагароджаны граматай Міністэрства культуры Беларусі і медалём БСМ "За заслугі ў выяўленчым мастацтве". Працуе ў галіне плаката, жывапісу, акварэлі і афармляльніцкага майстэрства.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

Чытайце ў нумары:

НАН БЕЛАРУСІ І БДУ: НАВУКОВА-АДУКАЦЫЙНЫ АЛЬЯНС

Вядучая ВНУ краіны і галоўная навуковая ўстанова дамовіліся шчыльна супрацоўнічаць

Стар. 2

РАСКРЫЦЦА МОЖНА ТОЛЬКІ Ў СВАЁЙ КРАІНЕ

На сустрэчы з маладымі вучонымі рэктар БДУ акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА расказаў пра свой шлях у навуку і пазначыў перспектывы

Стар. 3

ВЫГАДАВАЛІ МЕРКАВАННЕ

Рэдактары студэнцкіх газет і лідары моладзевых арганізацый з 39 ВНУ краіны ўзялі ўдзел у IV "Зімовай школе журналістыкі" на базе САК "Брыганціна"

Стар. 4

ПАДЗЕЯ

# СУПЕРКАМПУТАР БДУ – аснова мегапраекта

***Урачыстае адкрыццё суперкампутарнага цэнтра БДУ адбылося 12 лютага ў галоўным корпусе Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Звышпрадукцыйны суперкампутар "СКІФ К-1000-05", да таго ж, павінен стаць важным звяном нацыянальнай навукова-адукацыйнай кампутарнай ГРІД-сеткі, якая зараз праектуецца.***



*Дырэктар ЦІТ БДУ Юрый Варатніцкі дэманструе "СКІФ К-1000-05"*

У цырымоніі прымалі ўдзел міністр адукацыі нашай краіны Аляксандр Радзькоў, старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Міхаіл Мясніковіч, рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі Аляксандр Тузікаў, дырэктар Цэнтра інфармацыйных тэхналогій БДУ Юрый Варатніцкі.

Суперкампутар "СКІФ К-1000-05" – сумесная распрацоўка вучоных Беларусі і Расіі, створаная ў рамках міждзяржаўнай праграмы "Суперкампутарная ініцыятыва "Фенікс". Каштуе ён каля 840 тыс. долараў.

Галоўныя распрацоўшчыкі – спецыялісты Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі (АІПІ) НАН Беларусі і Інстытута праграмных сістэм РАН – стваралі "разумную машыну" для правядзення навуковых даследаванняў і інжынерных разлікаў. Новыя лічбавыя магутнасці дазваляюць аператыўна аблічваць любыя праекты: ад пабудовы складаных атмасферных картаў да праектавання звышскладаных механічных або электронных вузлоў.

На базе суперкампутара БДУ мяркуецца стварыць вузел нацыянальнай і міжнароднай ГРІД-сетак (ГРІД – геаграфічна размеркаваная інфраструктура, якая аб'ядноўвае мноства рэсурсаў розных тыпаў (працэсары, доўгатэрміновая і аператыўная памяць, сховішчы і базы даных, сеткі), доступ да якіх карыстальнік можа атрымаць з любой кропкі, незалежна ад месца іх размяшчэння).

Сусветная ГРІД-сетка як сродак сумеснага выкарыстання вылічальных магутнасцяў і сховішчаў даных ідзе на змену Інтэрнэту з яго вэб-паслугамі. Аснову такой інфраструктуры складаюць суперкампутарныя кластары, якія дазволяць будучым спецыялістам – цяперашнім студэнтам і аспірантам – распрацоўваць рэсурсаёмістыя бізнес-дадаткі, удасканальвацца ў матэматычным мадэляванні, даследаваць мадэлі ў фізіцы, хіміі, механіцы і г.д.

Карыстанне вылічальнымі рэсурсамі суперкампутара СКІФ і ГРІД-сетак для навуковых даследаванняў забяспечыць навуковай школе БДУ інтэграцыю ў міжнародную ГРІД-сетку Baltic GRID. Як нядаўна стала вядома, патэнцыял "К-1000-05" будзе выкарыстоўвацца падчас міжнароднага эксперыменту на Вялікім адронным калайдэры. Апрацоўкай даных, атрыманых падчас даследаванняў на БАК, зоймуцца вучоныя Нацыянальнага цэнтра фізікі часціц і высокіх энергій БДУ разам з калегамі з Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў "Сосны".

На брыфінгу для шматлікіх СМІ міністр адукацыі *Аляксандр Радзькоў* паведаміў, што магчымасцямі новага цэнтра змогуць скарыстацца ўсе ВНУ Беларусі. Для гэтага паміж імі неўзабаве будзе наладжана ГРІД-сетка. Па словах міністра, такія новыя тэхналогіі патрэбныя ўсім інстытутам і універсітэтам, асабліва тэхнічнага профілю. "Гэта машына каштуе вельмі дорага, таму праводзіць з яе дапамогай навуковыя даследаванні павінны студэнты і вучоныя не толькі БДУ, але і іншых універсітэтаў", – адзначыў Аляксандр Радзькоў. Гаворка перш за ўсё пра спецыялістаў з БДУІР, БДЭУ, але і гуманітарныя ВНУ таксама зацікаўленыя. Міністр падкрэсліў, што "суперкампутар дазваляе арганізоўваць даследаванні адразу па некалькіх кірунках, абсалютна розных паміж сабой". Пытанне, у якіх навуковых работах будзе выкарыстоўвацца суперкампутар "СКІФ К-1000-05", пакуль што вырашаецца.

У сваю чаргу старшыня Прэзідыума НАН Беларусі *Міхаіл Мясніковіч* дадаў, што суперкампутарныя тэхналогіі дапамагаюць вырашаць важныя задачы для прамысловасці. Яны выкарыстоўваюцца на БелАЗе, МАЗе, у навукова-даследчым інстытуце дзяржваенпрома. "Мы рады, што суперкампутарныя тэхналогіі сталі ў нашай краіне не адзінкавым экзэмплярам, што мы маем сёння цэлае сямейства такіх машын", – падкрэсліў ён.

Пасля цырымоніі адкрыцця на геаграфічным факультэце прайшоў навукова-практычны семінар "Суперкампутарныя і ГРІД-тэхналогіі ў навуцы і адукацыі" з удзелам педагогаў, вучоных, аспірантаў і студэнтаў БДУ, а таксама Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы, спецыялістаў АІПІ НАН Беларусі.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

Фота Аляксандра СНАПКА

Асноўныя характарыстыкі К-1000-05: найвышэйшая прадукцыйнасць – 2,5 трыльёны аперацый у секунду; сумарны аб'ём аператыўнай памяці – 500 Гбайт; колькасць працэсараў – 288 (144 двухпрацэсарныя вузлы на базе 64-разраднага працэсара Opteron – 2200 Мгц); сумарны аб'ём дыскавай памяці – 11 тэрабайт; камунікацыйная сетка – InfiniBand; габарыты – 2.4 x 1.07 x 2.07 м; вага – 3,2 т; энергаспажыванне – 45 Квт; узровень шуму – 80 Дб; неабходны струмень паветранага ахаладжэння – 4–8 тыс. куб. м/г.

## Весткі з рэктарата

ГЛАВА прадстаўніцтва Еўрапейскага Саюза ва Украіне і Беларусі Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйра ў рамках рабочага візіту ў Мінск 15 лютага наведаў БДУ. Ён абмеркаваў з рэктарам Сяргеем Абламейкам магчымасць супрацоўніцтва. Госць азнаёміўся таксама з дзейнасцю Інфапункта ЕС і выступіў з лекцыяй перад студэнтамі факультэта міжнародных адносін.

***

ДЭЛЕГАЦЫЯ Нямецкай навуковай супольнасці (DFG) у складзе дырэктара аддзела Усходняй Еўропы і краін СНД доктара Крысціяна Шайха і кіраўніка Маскоўскага бюро DFG доктара Йорна Ахтэрберга 12 лютага наведала наш універсітэт, дзе правяла перамовы аб перспектывах супрацоўніцтва з прарэктарам па навуковай рабоце БДУ Алегам Івашкевічам.

***

АМБАСАДАР Італьянскай Рэспублікі ў Беларусі Джуліо Прыджоні 24 лютага выступіў перад студэнтамі і выкладчыкамі з лекцыяй на тэму "Эканоміка і этыка".

***

РЭКТАР БДУ Сяргей Абламейка прыняў удзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Якасць універсітэцкай адукацыі: стан, праблемы, перспектывы", якая адбылася ў Гродне 24-25 лютага.

Навукоўцы Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы, Германіі абмеркавалі інавацыйныя шляхі развіцця. Адбыўся круглы стол з удзелам рэктараў еўрапейскіх і расійскіх ВНУ, прысвечаны міжнароднаму супрацоўніцтву універсітэтаў і іх інтэграцыі ў сусветную адукацыйную прастору. Сярод вынесеных на абмеркаванне праблем – магчымасці "Усходняга партнёрства" для пашырэння супрацоўніцтва з ЕС, гарманізацыя сістэм адукацыі ў рамках Балонскага працэсу і інш.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# АБВЯШЧАЮЦЦА КОНКУРСЫ
## на суіскание прэмій імя У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі ў 2010 г.

***У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку прысуджэння прэмій імя У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі, зацверджаным загадам БДУ ад 12 лютага 2010 г. № 61-ОД, абвяшчаецца конкурс на прысуджэнне прэмії імя У.І. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук (адна праца), імя А.Н. Сеўчанкі ў галіне прыродазнаўчых навук (адна праца).***

**Прэміі прысуджаюцца за выбітныя дасягненні, якія ўключаюць:**

- навуковыя працы па перспектыўных кірунках, якія ўносяць значны ўклад у развіццё адпаведнай галіны навукі і тэхнікі;
- стварэнне новай тэхнікі, тэхналогій і матэрыялаў;
- працы па зберажэнні рэсурсаў і энергіі, абароне навакольнага асяроддзя і рашэнні іншых важных для краіны задач;
- распрацоўку новых адукацыйных тэхналогій, якія істотна павышаюць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў;
- стварэнне падручнікаў, навучальных дапаможнікаў і навучальнага абсталявання.

Дакументы падаюцца ў НДЧ-ГУН БДУ да 30 красавіка 2010 г. Падрыхтаваныя матэрыялы прымаюцца на адрас: вул. Бабруйская, 9, каб. 401 (аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі) з 14 да 16 гадзін штодня. На конкурс падаюцца працы асобных аўтараў і калектыўныя працы, лік суаўтараў працы не можа быць большым за чатыры чалавекі.

Інфармацыю па конкурсе можна атрымаць у аддзеле навукова-тэхнічнай інфармацыі (тэл. 209-53-92). Электронныя варыянты дакументаў размешчаны на серверы БДУ (Microsoft Outlook): *"Агульныя папкі" / "Усе агульныя папкі" / "Галоўнае ўпраўленне навукі" / "Конкурс А.Н. Сеўчанкі і У.І. Пічэты".*

**Паводле інфармацыі НДЧ-ГУН**

## ВІНШУЕМ!

***Загадам рэктара прызначаны імянныя стыпендыі на 2 семестр 2009-2010 навучальнага года студэнтам БДУ.***

**Стыпендыю імя Францыска Скарыны** будуць атрымліваць трэцякурсніца біялагічнага факультэта *Карына Савіцкая*, чацвёртакурсніца хімічнага факультэта *Раксана Давыдава*, пяцікурсніцы *Алена Панфілёнак* (ФРІЭ), *Віталіна Дзежамесава* (ФПМІ) і *Алена Голубева* (фізфак).

Студэнтцы 4 курса філалагічнага факультэта *Святлане Рогач* і пяцікурсніцы геаграфічнага факультэта *Юліі Губарэвіч* прызначаная **стыпендыя імя Якуба Коласа.**

**Стыпендыю імя Антона Сеўчанкі** атрымаюць студэнтка 4 курса фізічнага факультэта *Марына Лагацкая*, пяцікурсніца факультэта радыёфізікі і электронікі *Яўгенія Шынкевіч*, студэнт 5 курса эканамічнага факультэта *Сяргей Ісаеў*, трэцякурснік механіка-матэматычнага факультэта *Аляксей Гурэўскі* і студэнтка 4 курса ФПМІ *Алена Агеева*.

**Стыпендыя імя Максіма Багдановіча** прысуджаная трэцякурсніцы Інстытута журналістыкі *Алене Васільевай*, а **імя Петруся Броўкі** – трэцякурсніку гэтай жа ўстановы *Уладзіміру Сцяпанаву*.

Чацвёртакурсніцам *Валянціне Войтавай* і *Алене Ларыёнавай* (філфак), а таксама *Яўгеніі Лустач* (ФМА) прызначаная **стыпендыя імя Янкі Купалы**.

**Стыпендыю імя Кандрата Крапівы** атрымаюць чацвёртакурсніца *Дар'я Раманенка* і пяцікурсніца *Кацярына Камарова* ФФСН, студэнты 4 курса філалагічнага факультэта *Маргарыта Латышкевіч* і *Уладзіслаў Парыцкі*, а таксама чацвёртакурснік гістарычнага факультэта *Дзмітрый Анацка*.

**Стыпендыя імя Івана Шамякіна** прызначаная студэнту 5 курса механіка-матэматычнага факультэта *Івану Блізнюку*, чацвёртакурсніцы біялагічнага факультэта *Марыі Пляваць*, студэнтцы 3 курса юрыдычнага факультэта *Крысціне Марчук*, студэнтцы 5 курса факультэта міжнародных адносін *Марыі Даніловіч* і студэнту 5 курса гістарычнага факультэта *Дзмітрыю Зайцаву*.

Чацвёртакурсніца філалагічнага факультэта *Анастасія Албут* будзе атрымліваць **стыпендыю імя Івана Навуменкі**.

***

Трэцякурснік юрыдычнага факультэта *Алег Стоцкі* і чацвёртакурснік гістарычнага факультэта *Уладзімір Паўлюковіч* удастоеныя **стыпендыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі**. Абодва студэнты актыўна займаюцца грамадскай працай.

Алег Стоцкі ўзначальвае камісію па жыллёва-бытавой працы прафкама студэнтаў БДУ, а Уладзімір Паўлюковіч – старшыня камісіі па вучэбна-выхаваўчай і сацыяльнай працы.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

# НАН БЕЛАРУСІ І БДУ: НАВУКОВА-АДУКАЦЫЙНЫ АЛЬЯНС

***Пагадненне аб супрацоўніцтве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Беларускага дзяржаўнага універсітэта падпісалі 19 лютага старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Міхаіл Мясніковіч і рэктар БДУ Сяргей Абламейка. Цырымонія адбылася на сумесным пасяджэнні рэктарата БДУ і Бюро Прэзідыума НАН Беларусі.***



Пагадненне прадугледжвае выкананне навуковых прац у рамках дзяржаўных праграм фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў, а таксама дзяржаўных, дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм і сумесных праграм і праектаў. Вучоныя і спецыялісты універсітэта змогуць карыстацца матэрыяльна-тэхнічнай базай і навуковым абсталяваннем акадэміі для навучальных, даследчых мэт. Супрацоўнікі НАН Беларусі будуць актыўна ўдзельнічаць у навучальным працэсе і падрыхтоўцы кадраў з найвышэйшай кваліфікацыі ў БДУ. Бакі дамовіліся аб'яднаць высілкі па ўдасканаленні працы ў галіне кіравання інтэлектуальнай уласнасцю, а таксама па актывізацыі навукова-даследчай дзейнасці маладых вучоных і студэнтаў па шырокім спектры кірункаў. Прадугледжваецца навукова-метадычнае супрацоўніцтва ў галіне моладзевай палітыкі.

Было адзначана, што за ранейшыя гады ўзаемадзеяння Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і БДУ было атрымана шмат добрых вынікаў: распрацавана прыкладное праграмнае забеспячэнне для рэспубліканскай аўтаматызаванай інфармацыйна-аналітычнай сістэмы "Траўма"; створаны і ўкаранёны сродак, які ахоўвае электратэхнічнае абсталяванне ад агню; распрацаваны спосаб вызначэння ўтрымання натуральных радыёнуклідаў радыю ў аб'ектах навакольнага асяроддзя і інш. Зусім нядаўна ў БДУ пры садзейнічанні НАН Беларусі быў адкрыты суперкампутарны цэнтр, які стварае перадумовы для выхаду навукі на якасна новы тэхналагічны ўзровень.



*Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Беларускім дзяржаўным універсітэтам падпісваюць старшыня НАН Беларусі Міхаіл Мясніковіч і рэктар БДУ Сяргей Абламейка*

Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі падзякаваў кіраўніцтву БДУ за ініцыятыву паглыбіць партнёрскія адносіны. Міхаіл Мясніковіч перакананы, што супрацоўніцтва НАН і БДУ неабходна пашыраць: "Калі падчас сумесных прац будуць узнікаць ідэі новых цікавых праектаў або формаў супрацоўніцтва, то варта ўключаць іх у працу. Трэба надаваць увагу гуманітарным навукам, часцей праводзіць круглыя сталы, чытанні і іншыя сумесныя мерапрыемствы..." З БДУ таксама звязаныя пэўныя спадзяванні па развіцці магістратуры НАН Беларусі. Па словах Міхаіла Мясніковіча, патрэбны "сумесныя працы паміж магістрантамі двух бакоў, хацелася б бачыць больш магістрантаў у акадэміі навук". Акрамя таго, старшыня Прэзідыума НАН парэкамендаваў акадэміку Ігару Валатоўскаму абмеркаваць з зацікаўленымі падраздзяленнямі БДУ магчымасць іх шырэйшага ўдзелу ў рэалізацыі комплексу мер па развіцці біялагічнай навукі ў Беларусі на 2010–2015 гг. Таксама Міхаіл Мясніковіч цалкам падтрымаў прапанову першага прарэктара БДУ Міхаіла Жураўкова аб удасканаленні працы кафедраў двайнога падпарадкавання (такіх на сёння 5) і аб распрацоўцы адпаведнай нарматыўнай базы. Напрыканцы кіраўнік галоўнай навуковай установы краіны заклікаў да сумеснага ўдзелу НАН Беларусі і БДУ ў рэсурсаёмістых міжнародных праграмах: навуковых праграмах Саюзнай дзяржавы, 7-й Рамачнай праграме Еўрапейскага Саюза, а таксама праектах Нямецкай даследчай супольнасці – DFG (найбуйнейшай навуковай арганізацыі з бюджэтам 2,6 млрд еўра ў год), з кіраўніцтвам якой абодва бакі нядаўна правялі перамовы.

Для выканання плана супрацоўніцтва БДУ з НАН Беларусі, разлічанага на тры гады, створаная каардынацыйная камісія на чале з прарэктарам БДУ па навуковай рабоце Алегам Івашкевічам і намеснікам старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Сяргеем Рахманавым.

Пасля цырымоніі Міхаіл Мясніковіч уручыў дыпломы лаўрэатам прэміі Расійскай акадэміі навук і НАН Беларусі 2009 г. за выдатныя навуковыя вынікі, атрыманыя падчас сумесных даследаванняў па тэме "Тэорыя, метады практычнага выкарыстання паралельных вылічэнняў на суперкампутарных архітэктурах сямейства СКІФ". Узнагароджаныя рэктар БДУ Сяргей Абламейка, намеснікі генеральнага дырэктара Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі Уладзімір Анішчанка і Сяргей Мядзведзеў.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

У БДУ на ўмовах штатнага сумяшчальніцтва прыцягваюцца да выкладчыцкай і навуковай працы прадстаўнікі розных структурных падраздзяленняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. На дадзены момант такіх супрацоўнікаў – **90** чалавек (палова якіх задзейнічаная ў навуковых установах комплексу БДУ). Сярод іх 6 акадэмікаў і 5 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі, 45 дактароў навук і 39 кандыдатаў навук.

Акадэмія навук з'яўляецца адным з асноўных заказчыкаў спецыялістаў нашай ВНУ. За апошнія тры гады атрымалі накіраванне на працу ў сістэму НАН Беларусі больш за **200** выпускнікоў, у год – каля 70 чалавек. Самымі запатрабаванымі за гэты перыяд былі выпускнікі біялагічнага (2007 – 22 чал., 2008 – 23 чал., 2009 – 16 чал.), фізічнага (19, 18, 23) і хімічнага (24, 8, 20) факультэтаў.

Сярод падраздзяленняў БДУ, якія найбольш цесна супрацоўнічаюць з інстытутамі НАН Беларусі, – НДІ ФХП, НДІ ПФП, НДІ ЯП, фізічны факультэт, факультэт радыёфізікі і электронікі, геаграфічны факультэт, біялагічны факультэт, механіка-матэматычны факультэт, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, хімічны факультэт, юрыдычны факультэт, філалагічны факультэт.

У справаздачным годзе ў БДУ выконвалася **289** заданняў **36** дзяржаўных праграм комплексных, фундаментальных, арыентаваных фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў, якія ўваходзяць у рэспубліканскі План найважнейшых навукова-даследчых прац ва ўсіх навуковых галінах (па 15 з іх БДУ з'яўляўся галаўным выканаўцам). Сумесна з НАН Беларусі БДУ ўдзельнічае ў распрацоўцы Пераліку дзяржаўных праграм фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг.

Акадэмічныя інстытуты давалі ў карыстанне падраздзяленням БДУ унікальнае і дарагое абсталяванне для навучальных і даследчых мэт. Працягвалі сумесную працу цэнтры па падрыхтоўцы кадраў (Вучэбна-навукова-метадычны цэнтр па фізіка-матэматычных навуках і Вучэбна-навуковы цэнтр па біялагічных навуках), лабараторыя металургіі (УП "Унікаштмет" і Фізіка-тэхнічны інстытут) і створаныя ў 2004 і 2006 гг. сумесным загадам НАН Беларусі і БДУ кафедры двайнога падпарадкавання:

– кафедра кампутарных сістэм апрацоўкі і абароны інфармацыі,
– кафедра агульнай і неарганічнай хіміі,
– кафедра клетачнай біялогіі і біяінжынерыі,
– кафедра прыкладной оптыкі,
– кафедра матэматычнага мадэлявання і кіравання.

Сумесная падрыхтоўка студэнтаў старэйшых курсаў вядзецца ў рамках "Асноўных кірункаў супрацоўніцтва ВНУ з навуковымі арганізацыямі НАН Беларусі". Вынікам творчага супрацоўніцтва БДУ і НАН Беларусі з'яўляецца напісанне і выданне сумесных навуковых прац.

На базе *кафедры тэорыі функцый* сумесна з *Інстытутам матэматыкі НАН Беларусі* была арганізаваная 5-я Міжнародная канферэнцыя "Аналітычныя метады аналізу і дыферэнцыяльных ураўненняў" (АМАДЭ-2009). Яна сабрала 128 матэматыкаў з 12 краін свету.

ПА ДОСВЕД

*Нядаўна перад маладымі выкладчыкамі і вучонымі БДУ з лекцыяй выступіў рэктар акадэмік Сяргей Абламейка.*

# РАСКРЫЦЦА МОЖНА ТОЛЬКІ Ў СВАЁЙ КРАІНЕ



Сяргей Уладзіміравіч адразу зазначыў, што будзе распавядаць не пра свае навуковыя здабыткі, а пра тое, як не страціць цікавасці да навуковай дзейнасці і не здрадзіць дапытлівасці. На яго думку, званне "навуковец" заўжды было ганаровым. Зразумела, шлях у навуку не адразу прыносіць матэрыяльныя дывідэнды, але трэба набрацца цярпення. Сяргей Уладзіміравіч прывёў прыклад са свайго жыцця, калі прыходзілася пісаць кандыдацкую дысертацыю на кухні, а побач бегалі двое маленькіх дзяцей. Затое якую вялікую асалоду прынесла яму абарона навуковай працы! Потым была доктарская дысертацыя...

Наогул, па словах рэктара, дзейнасць навукоўца заўсёды падзелена на знакавыя перыяды: ён як бы жыве ад адной "абароны" да другой. Менавіта гэтыя падзеі застаюцца ў яго свядомасці як найбольш важныя, акрамя, вядома, стварэння сям'і і нараджэння дзяцей. Каб не спыняцца на дасягнутым, трэба ставіць перад сабой усё новыя і новыя арыенціры. Навуковец звычайна працуе і робіць навуковыя адкрыцці ў адзіноце. І на першым этапе вельмі важна навучыцца самастойнасці. Аднак потым няблага было б набыць і арганізатарскія здольнасці, а таксама ўменне наладжваць навуковыя кантакты. Ды і доктарскую дысертацыю адначасна складана пісаць. А вось калі ты працуеш у навуковым калектыве, у лабараторыі, то дасягнеш мэты значна хутчэй. Сапраўдны навуковец, на думку рэктара, гэта камунікабельны і ўсебакова развіты чалавек. Нельга замыкацца толькі на сваіх даследаваннях, а важна дзяліцца імі з замежнымі калегамі, ездзіць на міжнародныя канферэнцыі і сімпозіумы. Тут без англійскай мовы не абысціся.

Сяргей Уладзіміравіч памятае час, калі беларусы толькі пачыналі супрацоўнічаць з замежнымі вучонымі, а таксама пісаць свае працы на англійскай мове. Сёння ўжо шмат хто выдаецца на Захадзе. Цяперашнім маладым навукоўцам застаецца толькі пераняць у старэйшага пакалення гэты вопыт. А вось ехаць назаўсёды працаваць за мяжу, на думку рэктара, не варта. "Толькі ў сваёй краіне вы зможаце раскрыцца па-сапраўднаму. Бо працуеце для сваёй радзімы і сваіх людзей", – запэўніў Сяргей Абламейка.

Дадзенае мерапрыемства для павышэння агульнаадукацыйнага і прафесійнага ўзроўню маладых навукоўцаў уваходзіць у цыкл, які запланаваў Савет маладых вучоных БДУ па агульных пытаннях адукацыі, педагогіцы і псіхалогіі, эканоміцы, паліталогіі, арганізацыі вытворчасці і інш.

**Ганна ЛАГУН**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# "Брыганціна" паблізэла. Наколькі?

***За 45 км ад Мінска на беразе штучнага возера раскінуўся спартыўна-аздараўленчы комплекс БДУ "Брыганціна". Да нядаўняга часу "Брыганціна" асацыявалася з чымсьці недасяжным: пуцёўкі даваліся толькі студэнцкаму актыву, ды і то па конкурсе. Зараз сітуацыя змянілася. Цяпер тут могуць адпачыць усе ахвотныя!***



Часткова гэтаму спрыяла даследаванне, якое ў лістападзе 2009 г. правяла студэнцкая сацыялагічная НДЛ "Соцыум" з ФФСН. Мэта яго – вывучыць меркаванне навучэнскай моладзі наконт арганізацыі адпачынку і аздараўлення ў САК "Брыганціна" на зімовых вакацыях. Вынікі паказалі, што 53,4% студэнтаў хацелі б апынуцца тут у гэты час.

На падставе гэтага апытання пярвічная прафсаюзная арганізацыя сумесна з камісіяй па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні БДУ арганізавала зімовы адпачынак з 26 студзеня па 1 лютага на базе САК "Брыганціна". Кошт пуцёўкі для навучэнцаў БДУ склаў 80 тыс. руб., 75 тыс. руб. паступіла з прафбюджэту, а астатняя частка – са сродкаў фонду вытворчага і сацыяльнага развіцця БДУ.

Нягледзячы на гэта, 59 месцаў пуставала: была выдадзена 41 пуцёўка са 100 магчымых. Як адзначаюць арганізатары, галоўнай прычынай незапатрабаванасці стала слабая інфармацыйная праца на факультэтах.

Студэнты, якія адпачылі ў "Брыганціне", прызнаюцца: сумаваць не прыйшлося. Праграма была вельмі насычаная. Яна ўключала спартыўныя і культурна-забаўляльныя мерапрыемствы, псіхалагічныя трэнінгі. Спартыўная частка была прадстаўленая більярдам, валейболам і баскетболам, настольным тэнісам, басейнам і катаннем на лыжах. Акрамя таго, штодня праводзіліся дыскатэкі, з канцэртам прыязджаў рок-гурт "Роспект".

Аднак гэта толькі для аматараў актыўнага адпачынку. З аздараўленнем ёсць праблемы. На базе няма свайго медперсаналу, лячэбныя працэдуры – у суседнім санаторыі. І ўсё за свой кошт! Праўда, як паказала апытанне, праведзенае сярод адпачывальнікаў, – гэта адзіны істотны мінус у працы "Брыганціны".

Увогуле, студэнтам знаходжанне тут вельмі спадабалася. Яны зацікаўленыя і ў далейшым правядзенні санаторна-курортнага лячэння на базе комплексу. Што ж, спадзяёмся, гэта мерапрыемства не стане апошнім, і "Брыганціна" зноў пацешыць наведнікаў сваёй гасціннасцю.

**Кацярына КЕРЭМША,**
**прэс-цэнтр прафкама студэнтаў**

СВЯТЫ

# АД САНЕТА ДА ПЕРАКЛАДУ

***Філалагічны факультэт 19–25 лютага зладзіў Тыдзень беларускай мовы.***

Адкрылася мерапрыемства літаратурна-музычнай кампазіцыяй "Табе складаю шчыры свой санет, прапрадзедаў маіх жывая мова...". Гасцямі студэнтаў і выкладчыкаў сталі дырэктар Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі, старшыня Міжнароднага камітэта славістаў Аляксандр Лукашанец, паэт Мікола Мятліцкі і ўзорны фальклорны калектыў "Кветкі" СШ № 71 г. Мінска.

Аляксандр Лукашанец сустрэўся са студэнтамі і выкладчыкамі філфака таксама 22 лютага – ужо як аўтар новай рэдакцыі "Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі". Вядомы вучоны выступіў разам з калегамі – старэйшымі навуковымі супрацоўнікамі НАН Беларусі, укладальнікамі "Беларускага арфаграфічнага слоўніка" кандыдатамі філалагічных навук Любоўю Кунцэвіч і Ірынай Кандрацеяй.

Наступны дзень быў прысвечаны беларускай навуцы. Яго галоўнымі дзейнымі асобамі сталі моваазнаўцы Мікалай Прыгодзіч, Ірына Гапоненка і Фёдар Клімчук.

24 лютага на факультэце прайшла пазнавальна-забаўляльная гульня "Філалогія і Я", у якой прынялі ўдзел студэнты 1 курса. Завяршыліся ўсе мерапрыемствы 25 лютага, які арганізатары прысвяцілі "беларускаму перакладу". У ліку запрошаных – члены Беларускай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы па перакладзе Святога Пісання на беларускую мову, а таксама доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Сербскай акадэміі навук і культуры Іван Чарота.

Тыдзень беларускай мовы прымеркаваны да Міжнароднага дня роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага па ініцыятыве ЮНЕСКА.

**Надзея МУРАЛЕВІЧ**

АБ'ЯВЫ


**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасады:

ДАЦЭНТА кафедры эканомікі і кіравання бізнесам (1)

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7; аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.

**ІНСТЫТУТ ТЭХНАЛОГІЙ ІНФАРМАТЫЗАЦЫІ І КІРАВАННЯ БДУ**

АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР
**на перападрыхтоўку**
па наступных кірунках:

– **Эканамічная кібернетыка** (кваліфікацыя: матэматык-эканаміст);

– **Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных сістэм** (кваліфікацыя: праграміст-аналітык);

– **Інфармацыйнае і прававе забеспячэнне бізнесу** (кваліфікацыя: эканаміст з веданнем права).

Навучанне да чэрвеня 2011 г., вячэрняе, 5 разоў на тыдзень.

Прымаюцца слухачы з вышэйшай адукацыяй і студэнты старэйшых курсаў.

Прыём заяў да 13 сакавіка (аўд. 512 і 515 гал. корп. БДУ, аўд. 739, вул. Кальварыйская, 9).

Тэлефон для даведак: 259-70-58; *www.itiubsu.by.*


КАНФЕРЭНЦЫІ

# ДНІ НАВУКІ ПА-НОВАМУ

***Канферэнцыя "Дні гісторыі навукі", прысвечаная навуковай і педагагічнай дзейнасці выбітнага расійскага вучонага-хіміка Дзмітрыя Мендзялеева, прайшла 17 лютага.***

Яе галоўнымі адрасатамі сталі студэнты 1 курса. Перад імі на пленарным пасяджэнні выступілі: намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі член-карэспандэнт НАН Беларусі Сяргей Рахманаў; прарэктар па навуковай рабоце БДУ акадэмік НАН Беларусі Алег Івашкевіч; дэкан хімічнага факультэта прафесар Уладзімір Панькоў; кіраўнік прадстаўніцтва еўрапейскага акцыянернага таварыства "BASF SE" (ФРГ) у Беларусі Вольга Масяйчук; намеснік дэкана хімфака па навуковай рабоце дацэнт Таццяна Савіцкая і студэнты 4 курса хімічнага факультэта.

Адметнасць сёлетніх "Дзён" у тым, што іх праводзілі для першакурснікаў старэйшыя таварышы. Менавіта такая адукацыйная тэхналогія, вядомая ў свеце як "Peer-Led Team Learning" ("навучанне лідарам з аднагодкаў"), уключаная ў комплексную праграму працы хімічнага факультэта з адоранымі навучэнцамі і студэнтамі, і з'яўляецца эфектыўным сродкам павышэння якасці адукацыі.

З дакладаў першакурснікі даведаліся, што Д.І. Мендзялееў быў не толькі стваральнікам перыядычнай сістэмы элементаў, але і ўнёс значны ўклад у тэорыю раствораў, даследаванне газаў, прапанаваў увесці тэрмадынамічную шкалу тэмператур, распрацаваў і ўкараніў прамысловую тэхналогію вытворчасці газы з нафты, напісаў найлепшы падручнік свайго часу "Асновы хіміі", у адным з раздзелаў якога былі закладзеныя перадумовы развіцця сучаснай нанахіміі. Падчас дыскусій студэнты выказалі навеянае нядаўнім Днём святога Валянціна шкадаванне толькі пра тое, што не была расказаная гісторыя кахання Мендзялеева.

"Дні гісторыі навукі" праводзяцца на хімічным факультэце з 2007 г. і носяць міждысцыплінарны характар, што дазваляе разглядаць адкрыцці ў галіне фізікі, хіміі і біялогіі ў якасці адзінага і неад'емнага складніка сусветнай навуковай карціны свету.

Упершыню ў "Днях гісторыі навукі" прыняў удзел патэнцыйны працадаўца выпускнікоў факультэта – лідар сусветнай хімічнай галіны нямецкая кампанія "BASF". Узаемная карысць падобных прафарыентацыйных кантактаў відавочная. Яны спрыяюць фарміраванню ў студэнтаў выразнай прафесійнай мэты, узважанага і ўсвядомленага выбару месца працы, а кампаніі дазваляюць мінімізаваць рызыку па падборы кваліфікаванага персаналу.

**Мікіта МОНІЧ**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Адкрыццё ў БДУ суперкампутарнага цэнтра** – БелТА (11.02; 12.02); "Минск-новости" (11.02); "Народная газета" (12.02; 13.02); БелаПАН (12.02); "Рэспубліка" (13.02); "Советская Белоруссия" (13.02); sb.by (16.02); tut.by (15.02); mssng.ru (12.02); "Знамя юности" (12.02); "Звязда" (15.02); naviny.by (15.02); "Настаўніцкая газета" (16.02); "Веды" (15.02; 22.02).

**Дамова аб супрацоўніцтве паміж БДУ і НАН Беларусі** – БелТА (19.02); news.21.by (19.02); "Знамя юности" (12.02).

**Жыццё студэнтаў у новым інтэрнаце БДУ ў студэнцкай вёсцы** – "Минский курьер" (17.02); "Вечерний Минск" (10.02).

**Візіт у БДУ кіраўніка прадстаўніцтва ЕС у Беларусі і Украіне Жазэ Мануэля Пінту Тэйшэйры** – БелТА (15.02); БелаПАН (15.02); "Рэспубліка" (16.02).

**Выстава-кірмаш "Каменная казка"** – БелТА (14.02); "Минск-новости" (15.02); "Звязда" (17.02).

**"Зімовая школа журналістыкі"** – "Минск-новости" (15.02); "Минский курьер" (17.02).

**20-годдзе ліцэя БДУ** – працяг публікацый: "Звязда" (10.02); "Вечерний Минск" (10.02); "Знамя юности" (12.02); "Настаўніцкая газета" (20.02).

**Уступленне БДУ ў Еўрапейскую асацыяцыю універсітэтаў** – працяг публікацый: "Вечерний Минск" (11.02); "Народная газета" (10.02); "7 дней" (11.02); "Настаўніцкая газета" (11.02); open.by (15.02)

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ПАЛЕМІКА

# КРУГЛЫ СТОЛ – ВОСТРЫЯ ПЫТАННІ

***Круглы стол "Вышэйшая адукацыя вачыма студэнтаў і выкладчыкаў" прайшоў 17 лютага ў бібліятэцы юрыдычнага факультэта.***

Арганізатары мерапрыемства – Савет старастаў БДУ і Студэнцкі савет па якасці адукацыі. У ім узялі ўдзел студэнты, выкладчыкі, кіраўнікі ВНУ на чале з рэктарам Сяргеем Абламейкам.

Было разгледжана пытанне профільнага навучання ў школах, а таксама захадаў па прыцягненні найлепшых абітурыентаў. Удзельнікі круглага стала абмяркоўвалі магчымасць накіравання студэнтаў у сярэднія навучальныя ўстановы для інфармавання патэнцыйных абітурыентаў пра наш універсітэт. Асобна гаварылі пра ўплыў цэнтралізаванага тэсціравання на якасць падрыхтоўкі абітурыентаў пры паступленні ў ВНУ. Меркаванні падзяліліся, яшчэ раз паказаўшы складанасць праблемы адбору маладых людзей для вучобы ў БДУ. Дыскусія ішла таксама наконт механізмаў, якія даюць магчымасць студэнтам старэйшых курсаў уплываць на змест дысцыплін па іх спецыяльнасці.

Падводзячы вынікі абмеркавання, рэктар падкрэсліў важнасць падобнага мерапрыемства і пацвердзіў патрэбу універсітэта ў дыялогу са студэнтамі і гатоўнасць да яго. Савету старастаў БДУ даручана распрацаваць прапановы па аптымізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

**Дзмітрый ІВАШУЦІН**

СУСТРЭЧЫ

# Праз шведскую прызму

***Госцем Інстытута журналістыкі БДУ 16 лютага быў генеральны дырэктар Шведскай адукацыйнай радыёвяшчальнай кампаніі Эрык Фіхтэліус.***



Яго сустрэча з выкладчыкамі і студэнтамі доўжылася з перапынкам амаль 5 гадзін і была надзвычай карыснай. Вядомы журналіст-практык падзяліўся сваім багатым прафесійным вопытам, а таксама расказаў пра некаторыя эфектыўныя медыйныя тэхналогіі.

Аўтар нашумелай кнігі "Дзесяць запаведзяў журналістыкі" заклікаў беларускія СМІ прытрымлівацца галоўнага пастулата працы незалежнай прэсы – нейтральнага выкладу фактаў. На яго думку, нейтралітэт дазваляе прэсе атрымаць сапраўдную свабоду ад камерцыйных структур і палітычных партый.

Паралельна з гэтым Эрык Фіхтэліус панаракаў на негатыўную тэндэнцыю ў справе навучання будучых "акул пяра" ў свеце. Па словах шведскага эксперта, журналісцкія курсы ў ВНУ сталі на шлях тэарэтызацыі, у той час як сама прафесія – выключна практычная.

Дадзеная сустрэча прайшла ў межах семінара, арганізаванага Інстытутам павышэння кваліфікацыі журналістаў FOJO (г. Кальмар, Швецыя), па тэме "Еўрапейскія стандарты ў працы з інфармацыяй". У мерапрыемстве таксама бралі ўдзел кіраўнік праектаў FOJO па паўночнакаўказскім рэгіёне і СНД Вераніка Мянжун і кіраўнік праграмы непасрэдна з Інстытутам журналістыкі БДУ Агнета Якабсон. Дарэчы, у сярэдзіне сакавіка плануецца візіт у Мінск дырэктара Інстытута FOJO Анэлі Эверс для працягвання супрацоўніцтва на наступныя 3 гады.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Выгадавалі меркаванне

***Рэспубліканскі семінар-практыкум "Зімовая школа студэнцкай журналістыкі" прайшоў у САК "Брыганціна" 19–21 лютага. Рэдактары студэнцкіх газет і лідары моладзевых арганізацый з 39 ВНУ краіны дзяліліся досведам і практыкаваліся ў ажыццяўленні супольных праектаў.***



Нагадваем: "Зімовая школа студэнцкай журналістыкі" ладзіцца БДУ раз на два гады. Упершыню гэты семінар-практыкум наведалі студэнцкія рэдакцыі сталічных ВНУ (у 2004 г.), да 2006 г. ініцыятыва паспела зацікавіць усю краіну, у 2008 г. "школа" набыла статус міжнароднай. Адметнасць гэтага года – вяртанне да рэспубліканскіх маштабаў і прыцягненне да ўдзелу поруч з журналістамі лідараў студэнцкіх арганізацый.

## ПАЎНОЧНЫ МЕДЫЯБАРКЭМП І ІНШЫЯ ЗАБАВЫ



Сёлетняя праграма была настолькі насычанай, што не ўкладалася ні ў светлавы дзень, ні ў межы звыклых акадэмічных гадзін: адпачынак у раскладзе значыўся пасля 01.00. За тры дні навучэнцы мусілі:

– наведаць 8 вучэбных секцый і выканаць атрыманыя там заданні,

– прайсці трэнінг на камандаўтварэнне,

– прабегчы фотамарафон,

– заняць месца ў ролевай гульні,

– патанчыць на дыскатэцы, перазнаёміцца, пасябраваць,

– выведаць сакрэты прафесіі ў вядомых журналістаў,

– задаць свае пытанні міністру адукацыі і рэктару БДУ,

– стварыць газету і зладзіць ёй піяр-кампанію,

– арганізаваць прэзентацыю свайго праекта...

Тым, хто скардзіўся на шчыльнасць праграмы, адны арганізатары жартам адказвалі, маўляў, вы ўсё адно не спалі б, а падчас сесій прызвычаіліся засвойваць шмат інфармацыі за адну ноч. Іншыя тлумачылі, што дамагаліся разняволенай атмасферы для запланаваных формаў заняткаў. Так, медыябаркэмп, ініцыяваны выкладчыкам Інстытута журналістыкі Аляксандрам Градзюшкам, прадугледжвае нязмушаны абмен ведамі: кожны, хто хоча падзяліцца карысный інфармацыяй, запісваецца ў адмысловай табліцы, а пасля цягам дваццаці хвілін распавядае свае ідэі тым, хто ўпадабаў заяўленую тэму і прыйшоў паслухаць.Ператварэнне "вучняў" у "настаўнікаў" і позні час правядзення па задумцы спрыяюць эфектыўнасці засваення ведаў. Кемлівыя старажылы "школы", аднак, пераканаўся, што праграма складалася такім чынам, каб не пакінуць студэнтам вольнага часу для злоўжыванняў і парушэнняў правіл унутранага распарадку.

Удзельнікаў падзялілі на 8 груп, кожная з якіх утварала рэдакцыю газеты. Да 4 палос выдання ставілі строгія патрабаванні: тэматычныя (трэба было размясціць інфармацыю пра ўсе вучэбныя секцыі, правесці журналісцкае расследаванне і асвятліць ролевую гульню), жанравыя (ацэньвалася ўменне правесці партрэтнае інтэрв'ю і ўвогуле карыстацца разнастайнасцю жанраў) і афармленчыя (улічвалася вёрстка, дызайн лагатыпа, наяўнасць выхадных даных і г.д.). Але ўменне добра пісаць і граматна афармляць напісанае было мала: чаго вартая цудоўная газета, пра якую ніхто не ведае? Ці не палова вучэбных заняткаў гэтым разам была прысвечана таму, каб навучыць студэнтаў прадаваць інфармацыйны тавар, піярыць сваё выданне.

## ЗАДАЧКІ АД МІНІСТРА

Міністр адукацыі акрэсліў асноўныя праблемы, над рашэннем якіх працуе яго ведамства:

1) распрацоўку і зацвярджэнне парламентам Кодэкса аб адукацыі; 2) размеркаванне працоўных плыняў і наданне ўвагі працоўным прафесіям, адукацыі "сярэдняга звяна"; 3) развіццё універсітэцкай навукі і спрыянне грунтоўнасці падрыхтоўкі навучэнцаў. Аляксандр Радзькоў разам з рэктарам БДУ Сяргеем Абламейкам сваю сустрэчу са слухачамі "школы" ацанілі як магчымасць вызначыць па рэакцыі аўдыторыі, наколькі правільныя робяцца захады. Такое паважанае стаўленне да іх меркавання акрыліла студэнтаў – і яны ўтварылі даўгую чаргу да мікрафона, дзе задавалі смелыя пытанні.

Дыяпазон іх быў вельмі шырокі. Пакуль у суседняй з актавай залай сталоўцы астываў суп, студэнты, забыўшыся на абед, распытвалі сваіх кіраўнікоў і пра агульнадзяржаўнае, і пра асабістае. Так, прыкладам, высветлілася, што спадар рэктар для рухаў па сталіцы аддае перавагу метро, бо там не працуе мабільны тэлефон і можна спакойна паразважаць, а спадар міністр у выпадковых паўзах бавіцца "чаргавымі" задачкамі.

*Вось напрыклад: дадзена 25 манет, адна фальшывая. Механічныя шалі. Рашыць: за два ўзважванні выявіць, з'яўляецца фальшывая манета лягчэйшай альбо цяжэйшай за сапраўдныя.*

Таксама студэнты даведаліся, што ўвядзенне дрэс-кода ў ВНУ пакуль не прадугледжваецца – да паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, а ў школе строгі стыль вопраткі застанецца; што іспыт па культуры маўлення для чыноўнікаў пакуль уводзіць не плануецца; што не варта чакаць пераходу на сістэму выбару курсаў па жаданні, як у амерыканскіх ВНУ (бо кожная сістэма адукацыі мае нацыянальныя асаблівасці, але тыя элементы, якія добра ўспрымае беларускі менталітэт і якія прыдадуцца ў нашай сітуацыі, возьмем), што профільную адукацыю ў школах не адмянялі, а скарачэнне колькасці гадзін па профільных прадметах звязана з агульнай разгрузкай школьнай праграмы... Нотки папулізму добра гучалі на гэтым свяце дэмакратыі: студэнцкі праект тэлеправграмы для моладзі Аляксандр Радзькоў падахвоціўся падтрымаць міністэрскай візай, а студэнта, які прагнуў персанальнай сустрэчы, запрасіў у міністэрства, назваўшы найлепшыя часы прыёму, і пры канцы сустрэчы пацісну руку.



*Кадр Паўла Махінава – адзін з пераможцаў фотамарафону*

## АГЛЕДЗІНЫ І ВЫБАР

Удзельнікі "школы" прывезлі са сваіх ВНУ студэнцкія выданні. У першы і другі дні газеты былі выстаўленыя для агульнага азнаямлення і візуалізавалі той фон, на якім праходзіла ўся "школа", задачай якой акурат і ёсць павышэнне ўзроўню студэнцкага друку. "Найлепшай газетай універсітэта" журы назвала выданне "Сушка" з ГДТУ імя П. Сухога. "Найлепшай газетай факультэта" заслужана прызналі "ЖурФАКТЫ" Інстытута журналістыкі БДУ. Дызайнам студэнцкіх медыя спецыялісты засталіся незадаволеныя і перамогу тут не прысудзілі нікому, меліся праблемы і з вызначэннем лаўрэатаў у намінацыях "Найлепшая газета моладзевай арганізацыі" (зрабіўшы зніжку на тое, што выданне робіцца не прафесіяналамі ў сферы масмедыя, абралі газету ІБМТ "Young Leader"), "Найлепшае выданне каледжа" (улічыўшы, што рэдактары яшчэ не прайшлі універсітэтаў, абралі двух намінантаў – "Вестник Колледжа", "Коллега"). "Найлепшае фота" было адшукана ў газеце "Шкаляр", за найлепшую канцэпцыю ўзнагародзілі выданне "Дзеці Фуко" БДПУ імя М. Танка, найлепшым праектам адзінадушна прызнаны часопіс "Унітайм" Студгарадка БДУ, добрымі назвамі вылучыліся выданні "Экватор" (геафак БДУ), "Clio" (гістфак БДУ), "ЭкоСфера" (МДЭУ імя А. Сахарава), дэбютам "школы" прызналі выданне ГДУ імя Ф. Скарыны "Ничего себе газета".

Асобны конкурс чакаў газеты, утвораныя 8 вучэбнымі групамі за 3 дні. Тут пераможцам стала выданне "ІМНО", якое пакарыла журы тонкай ды інтэлігентнай піяр-кампаніяй, сумленным выкананнем большасці заданняў і журналісцкай сціпласцю.

## ПАДВЫНІКУЕМ

"Школа" паказала, што яе ўдзельнікі маюць сваё меркаванне і ўмеюць яго бараніць.

Было падлічана, што за тры дні "Зімовай школы студэнцкай журналістыкі" яе навучэнцы спалі ў сярэднім 4 гадзіны, з'елі каля 30 кг пшонкі, раскідалі качкам каля 5 батонаў, прамачылі амаль 200 пар ботаў і прайшлі інтэнсіўную тэрапію ведамі. Ці палепшыцца ад усяго гэтага якасць студэнцкага друку, пакажа наступная "школа", наконт правядзення якой выказваліся наступныя прапановы: зрабіць семінар-практыкум штогадовым, а мо і часцейшым, а таксама пераносіць месца сустрэчы ў адзін з рэгіянальных універсітэтаў, кожным разам у іншы.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

26 лютага 2010 года
Падпісана да друку 25.02.2010 г.
Зак. . Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*